Латушкін, А. М. Экспедыцыя Віленскай навучальнай акругі і Віленскай археаграфічнай камісіі ў Нясвіжскі архіў Радзівілаў у 1867 г. / А. М. Латушкін // Крыніцазнаўства, археаграфія, архівазнаўства ў XX—XXI ст. у Беларусі: зб. навук. артыкулаў, прысвечаных 100-годдзю з дня нараджэння М. М. Улашчыка / рэдкал. : С. М. Ходзін (адк. рэд.) [і інш.]. — Мінск: БДУ, 2007. – С. 227-239

**А. М. ЛАТУШКІН (Мінск)**

# ЭКСПЕДЫЦЫЯ ВІЛЕНСКАЙ НАВУЧАЛЬНАЙ АКРУГІ І ВІЛЕНСКАЙ АРХЕАГРАФІЧНАЙ КАМІСІІ Ў НЯСВІЖСКІ АРХІЎ РАДЗІВІЛАЎ У 1867 г.

Экспедыцыя ў Нясвіжскі архіў прадстаўнікоў Віленскай навучальнай акругі і Віленскай археаграфічнай камісіі з'яўляецца важнай для асвятлення адразу некалькіх пытанняў. Па-першае, гэта адметная падзея ў гісторыі азначаных устаноў — вядучых навукова-ідэалагічных органаў Расійскаі імперыі на беларускіх землях і буйнейшага прыватнага архіва айчыннай арыстакратыі. Па-другое, яна характарызуе ўзаемадачыненні расійскай улады з мясцовай



элітай пасля паўстання 1863—1864 гг., выяўляе намеры, падыходы дзеячаў імперскай гістарыяграфіі пры вывучэнні дакументальных крыніц Вялікага княства Літоўскага (далей — ВКЛ) і Рэчы Паспалітай (далей — РП), дэманструе іх трактоўкі гістарычных працэсаў на далучаных тэрыторыях.

У гістарыяграфіі тэма закранал ася неаднаразова [5, 8, 150—151; 10, 57—69]. Новыя матэрыялы, выяўленыя аўтарам у фондзе Радзівілаў НГАБ (№694), аналіз выдадзенага ўдзельнікамі экспедыцыі зборніка дакументаў архіва дапаўняюць існуючыя веды па тэме, удакладняюць некаторыя істотныя яе аспекты, у прыватнасці арганізацыю і ход экспедыцыі, мэту і метады яе членаў, рэальнае стаўленне да расійскіх даследчыкаў з боку князёў Радзівілаў і іх адміністрацыі.

Да 60-х гг. XIX ст. Нясвіжскі архіў не трапляў у кола зацікаўленасці расійскіх дзяржаўных ідэалагічных органаў [10, 57]1. Актыўнасць у гэтым накірунку распачынаецца ў рэчышчы рэакцыі на паўстанне 1863—1864 гг. Найперш увага была праяўлена з боку Пецярбургскай археаграфічнай камісіі, пазней Віленскай навучальнай акругі і Віленскай археаграфічнай камісіі. Мэтай апошняй, як і іншых падобных утварэнняў, напрыклад Кіеўскай, Каўказскай камісій, з'яўлялася публікацыя гістарычных крыніц, што сведчылі б на карысць спрадвечнай этнічнай, моўнай, культурнай, рэлігійнай агульнасці далучаных тэрыторый з Расіяй, даказвалі б яе права на панаванне ў гэтых землях, садзейнічалі русіфікацыі насельніцтва, падтрымцы дзяржаўнай і рэлігійнай палітыкі Расійскай імперыі. Дадзеная дзейнасць атрымала азначэнне як «русское дело».

Ключавой асобай у справе наладжвання экспедыцыі ў Нясвіжскі архіў стаў М. В. Каяловіч, прафесар, даследчык царкоўнай гісторыі ВКЛ і актыўны дзеяч «русского дела» ў Паўночна-Заходнім краі. Усярэдзіне 1860-х гг. на адным з пасяджэнняў Пецярбургскай археаграфічнай камісіі ён выказаўся за неабходнасць даследавання гісторыі заходніх тэрыторый Расіі, сфармуляваў актуальныя праблемы для распрацоўкі, прапанаваў прынцыпы публікацыі крыніц.

Першым крокам у дадзеным накірунку павінна было стаць вывучэнне архіва рода князёў Радзівілаў у Нясвіжы. Камісія падтрымала М. В. Каяловіча і даверыла яму вывучэнне пытання атрымання доступу ў архіў [6, отд. III, 22—25]. Аб унікальнасці Нясвіжскага архіва М. В. Каяловіч даведаўся з вопісу, які змяшчаўся сярод папер польскага вучонага Чацкага, захоўваемых усярэдзіне XIX ст. у Імператарскай публічнай бібліятэцы Санкт-Пецярбурга. Прафесар паставіў сабе мэту даследаваць збор. Спроба патрапіць у архіў Радзівілаў была зроблена ім у першай палове 1866 г. і закончылася безвынікова. Незадоўга да

[1] Падрабязней аб Нясвіжскім архіве Радзівілаў у перыяд 1838—1873 гг. гл. артыкул аўтара [4].



таго Нясвіж наведваў і апякун Віленскай навучальнай акругі І. П. Карнілаў, якому таксама адмовілі ў жаданні агледзець сховішча [10, 91—92, № 8]. Адміністрацыя адмаўлялася дапускаць пабочных асоб без

дазволу гаспадароў, у выпадку ж гвалтоўнага пранікнення пагражала скласці скаргу да князёў Радзівілаў. М. В. Каяловіч пісаў у жніўні 1866 г. загадчыку аддзела рукапісаў Імператарскай публічнай бібліятэкі А. Ф. Бычкову: «Как ни тянет меня в этот архив, но мои убеждения не позволяют облечь в военное положение, если можно так выразиться, мои ученые изыскания» [10, 60—61].

На самой справе пазіцыя прафесара не адрознівалася міралюбствам. Яго аўтарству належыць план пранікнення ў архіў «сакрэтнага агента» для атрымання неабходных звестак аб яго складзе, але гэты шлях не прынёс станоўчых вынікаў. Не жадаючы адмаўляцца ад ідэі, М. В. Каяловіч і І. П. Карнілаў звярнуліся да вышэйшых улад края. Першым з іх было падрыхтавана спецыяльнае паведамленне з аргуметацыяй неабходнасці доступу ў архіў расійскіх даследчыкаў, другі ж прадставіў яго віленскаму генерал-губернатару К. П. Каўфману [10, 91—92, № 8]. Варыянт недатаванага паведамлення («запіскі») М. В. Каяловіча аб Нясвіжскім архіве, які, верагодна, і прызначаўся для ўказанага адрасата, апублікаваў В. Ульяноўскі[1]. У дадзеным дакуменце М. В. Каяловіч паведамляў аб вялікай навуковай каштоўнасці збору, выкладаў прававыя падставы на доступ да яго расійскіх даследчыкаў і меркаванні аб шляхах гэтага доступу.

Важна тое, што прафесар заявіў аб агульнадзяржаўным, а не прыватным статусе Нясвіжскага архіва, спасылаючыся на прывілей Жыгімонта Аўгуста 1551 г. Звяртаючы ўвагу на «недабранадзейнасць» адміністрацыі Радзівілаў, яе негатыўнае стаўленне да расійскіх даследчыкаў у процівагу польскім, М. В. Каяловіч заклікаў да ўстанаўлення кантролю над архівам з боку мясцовых улад, лічыў прымальным самавольны доступ да дакументаў пад сцягам «русских государственных и ученых нужд» без дазволу Радзівілаў [10, 89—91, № 7].

---

[1] Недатаваную запіску М. В. Каяловіча аб значнасці Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў і неабходнасці яго вывучэння ўпершыню выявіў М. М. Улашчык у Цэнтральным дзяржаўным гістарычным архіве Літоўскай ССР. Ён датаваў крыніцу пачаткам 1865 г. [8, 150—151]. Варыянт запіскі знойдзены В. Ульяноўскім у Расійскай нацыянальнай бібліятэцы ў фондзе І. П. Карнілава, у параўнанні з экземплярам М.М. Улашчыка адрозніваецца паўнатой інфармацыі, апісваючай архіў і яго значэнне, выкладаннем стратэгіі атрымання доступу да Нясвіжскага архіва. В. Ульяноўскі разглядае яго ў якасці першапачатковага і датуе 1864 г. (пакідаючы і верагоднасць датыроўкі М. М. Улашчыка) [10, 57—69, 89—91, № 7). Аналіз зместу запіскі і супастаўленне яе з лістамі М. В. Каяловіча да розных асоб, датаванымі 22.07.1866 г., 15.08.1866 г., і лістом менскага губернатара П. Н. Шалгунова ад 17.08.1866 г. дазваляе зрабіць выснову, што яна была напісана ўсярэдзіне 1866 г., не пазней 22 ліпеня, для прадастаўлення вышэйшым уладам [10, 91—92, № 8; 92—93, № 9; 93—94, № 10).



Па пытанні архіва генерал-губернатарам К. П. Каўфманам быў зроблены запыт да мінскага губернатара П. Н. Шалгунова. У ліпені 1866 г. падчас аб’езду Слуцкага павета апошні наведаў Нясвіжскі замак. Ён правёў размову з адміністрацыяй Радзівілаў аб магчымым візіце генерал-губернатара ў Нясвіж падчас яго прабывання ў мінскай губерніі ў верасні таго ж года. Акрамя таго, перадаў просьбу К. П. Каўфмана аб дазволе выбранай асобе агледзець дакументальны збор. Адказ кіраўніка адміністрацыі аказаўся адмоўны, але тактычны і аргументаваны (галоўным чынам адсутнасцю дазволу гаспадароў архіва) [2, 5, 6—6 адв.]. 17 жніўня 1866 г. у сваім лісце да К. П. Каўфмана і І. П. Карнілава П. Н. Шалгуноў адзначаў, што пакуль адсутнічае нагода для камандзіроўкі ў Нясвіжскі архіў і выкарыстання яго дакументаў. Губернатар адмаўляўся ад якіх бы там ні было супрацьпраўных дзеянняў і выказаў дальнабачнае дапушчэнне, што здабытыя падобным шляхам дадзеныя і пабудаваныя на іх даследаванні будуць сумніўнымі, выклічуць негатыўныя інтэпрэтацыі з боку асоб «…не сочувствующих русскому делу» [10, 93—94, № 10]. П. Н.Шалгуноў прапаноўваў цывілізаваны і найбольш рэальны шлях вырашэння праблемы: атрымаць праз міністра народнай асветы дазвол ад саміх князёў Радзівілаў (уладальнікі архіва князі Багуслаў і Вільгельм тады пастаянна пражывалі ў Берліне). Маючы звесткі аб іх лаяльнасці да расійскіх улад, губернатар нават дапускаў, што князі могуць даць згоду на перадачу некаторых матэрыялаў у Публічную бібліятэку [10, 93—94, № 10].

Падобная пазіцыя мела пад сабой падставы. Радзівілы не давалі нагоды для абвінавачванняў у падтрымцы паўстанцаў 1863—1864 гг. У разглядаемы час з іх была знята забарона на набыццё маёнткаў у Заходняй Расіі. Гэта сведчыць аб павышэнні даверу з боку расійскіх улад. Аднак сітуацыя не была адназначнай.

Важную інфармацыю падае сакрэтны ліст В. Маліноўскага, галоўнага упраўляючага маёнткамі, да князя Антонія ад 29 жніўня /10 верасня 1866 г., які захоўваецца ў мінскай частцы архіва. Варта ўлічваць тое, што ў 1866 г. рэакцыя на паўстанне 1863—1864 гг. яшчэ працягвалася. Згодна з крыніцай ва ўладаннях

Радзівілаў яна праяўлялася ў выглядзе адкрытага прымусу да пераходу каталікоў (пераважна з сялян, мяшчан, засцянковай шляхты) у праваслаўе, планах ператварэння Фарнага касцёла — які быў пабудаваны Радзівіламі, з’яўляўся родавым нікропалем і ўтрымліваўся на іх сродкі — у праваслаўны сабор, іншых фундуемых імі касцёлаў — у цэрквы і г. д. [2, 5—7 адв.] Такія небяспечныя для Радзівілаў абставіны, акрамя таго, абвінавачванні іх служачых у кантактах з паўстанцамі ўказвалі на нестабільнасць і непрадказальнасць сітуацыі, падцвярджалі верагоднасць самаўпраўных дзеянняў, у тым ліку ў адносінах да архіва. Кіраўнік нясвіжскай адміністрацыі В. Маліноўскі дапускаў магчымасць нават рэквізіцыі дакументальных каштоўнасцей. У сувязі з гэтым па яго загадзе архіварыусамі



М. Богушам-Шышкай і Р. Сымановічам важныя ў гістарычным сэнсе рукапісы таемна перамясцілі на часовае захоўванне ў архіў клецкага ардыната Леона Радзівіла ў Радзівілімонтах. Згодна з выпрацаванай версіяй у 1856 г. князі Радзівілы перавезлі частку архіва ў Берлін [2, 6 адв. — 7 адв.].

11 красавіка 1867 г. Радзівілы выдалі дазвол на працу даследчыкаў у Нясвіжскім архіве [1, 49—49 адв., 51—51 адв.; 3, VII]. 16 чэрвеня 1867 г. апякун Віленскай навучальнай акругі І. П. Карнілаў накіраваў туды для «археаграфічных заняткаў» наступных асоб: 1) памочніка начальніка Віленскага цэнтральнага архіва і сябра Віленскай археаграфічнай камісіі Гільтэбрандта Пятра Андрэевіча; 2) выкладчыка гісторыі ў Віленскай класічнай гімназіі Міратворцава Афанасія Ільвовіча; 3) прафесара Літоўскай духоўнай семінарыі Ф. Елявонскага (В. Ульяноўскі адносіў яго да складу Пецярбугскай археаграфічнай камісіі); 4) настаўніка Гіжэўскага (Чыжэўскага?). Праца іх заключалася ў праглядзе вопісаў і дакументаў архіва, перапісванні і зняцці палеаграфічных адбіткаў з адметнейшых з іх [1, 50—50 адв.][1] Адначасова Нясвіжскі архіў наведаў і член Пецярбугскай археаграфічнай камісіі, стацкі дарадца М. І. Кастамараў [1, 52—52 адв.]. Знаходжанне даследчыкаў з Вільні працягвалася з 24 чэрвеня па 7 ліпеня 1867 г. Паўторны прыезд для зверкі копій быў здзейснены ў 1869 г. Найбольш значную ролю ў экспедыцыі адыграў П. А. Гільтэбрандт. А. І. Міратворцаў быў выдзелены яму ў якасці памочніка. Акрамя таго, неўзабаве пасля прыезду ён захварэў і 4 ліпеня выехаў. Перапіскай дакументаў займаліся Гіжэўскі і трое пісцоў, нанятых са складу служачых архіва [1, 53—53 адв.]. Дадзеныя аб рабоце Ф. Елявонскага адсутнічаюць. З боку адміністрацыі Радзівілаў гасцям быў наладжаны ветлівы прыём. Даследчыкаў уразілі ўнутраная ўпарадкаванасць архіва, пошукава-даведачныя матэрыялы, умовы захоўвання дакументаў. Персанал архіва аказваў ім поўнае садзейнічанне. П. А. Гільтэбрандт высока ацэньваў прафесійны ўзровень архіварыусаў Р. Сымановіча і М.-Б.Шышкі, характарызаваў іх як вельмі дасведчаных, адукаваных асоб.

Разам з тым пэўныя абмежаванні ў адносінах да расійскіх вучоных прысутнічалі. Навукоўцы адзначалі небывалы для прыватных архіваў аб’ём — амаль у дзесяць разоў большы за архіў Сапег (з Дзярэчына?)[2]. Аднак непасрэдна ў іх распараджэнне было прадастаўлена толькі чатыры аддзелы дакументаў з т. зв.

---

[1] Т. Е. Лявонцьева памылкова пазначала пасады на 1867 г. Гільтэбрандта П. А. і Міратворцава А. І.: першага — як загадчыка рукапіснага аддзялення Віленскай Публічнай бібліятэкі, другога — як загадчыка археолага-нумізматычнага аддзялення Віленскага музея [5, 315].

[2] Згодна з падлікамі археографаў аб’ём Нясвіжскага архіва складаў больш за 500 000 дакументаў [3, VI—VII]. Гэтыя даныя, якія пазней патрапілі ў літаратуру як аб’ём усяго архіва, аказаліся значна заніжанымі.



гісторыка-літаратурнай часткі архіва. Згодна з тагачаснымі спісамі аддзелаў гэта складала прыблізна 1/5—1/6 часткі ад іх агульнай колькасці. Больш таго, шмат найбольш каштоўных дакументаў было ці перавезена Радзівіламі ў Берлін у 1858, 1866—1867 гг., ці ўтоена ад даследчыкаў. Некаторыя зацікавіўшыя іх дакументы былі ў часовым карыстанні розных асоб. Каля паловы склада аддзела гістарычных дакументаў аказалася недаступным. Як сведчылі В. Маліноўскі і ўсе служачыя архіва, акты былі вывезены князем Антоніем Радзівілам у Берлін (верагодна схаваны ў Радзівілімонтах. — А. Л.). Нягледзячы на гэта, па словах П. А. Гільтэбрандта, даступных рукапісаў было дастаткова, каб заняць некалькі месяцаў.

Адным з асноўных аб’ектаў пошуку сталі рукапісы на рускай мове, але чаканні даследчыкаў не апраўдаліся. Асобны аддзел складалі граматы і лісты на пергаміне і паперы з XIV па XIX ст. Дакументы XIV

ст. — менавыя і прадажныя акты, падцвярджальныя каралеўскія прывілеі — былі напісаны выключна на лацінскай мове. Рускія граматы даследчыкі выявілі толькі сярод матэрыялаў XV, XVI ст., але ў колькасці не болей 40. Пераважна гэта былі акты куплі-продажу на зямлю. Да пачатку XV ст. быў аднесены і знойдзены сярод гістарычных дакументаў невялікі ўрывак Слуцкага летапісу ў лацінскай транскрыпцыі XVIII ст. [3, 1][1]. П. А. Гільтэбрандтам апрацавана больш чым 359 тэк аддзела карэспандэнцыі. Асобна археограф адзначыў 88 лістоў князя К. К. Астрожскага, каля 20 лістоў князёў Слуцкіх і іншых вядомых асоб. Аднак даследчык вымушаны быў канстатаваць наступнае: «Досаднее всего, что даже в XVI в. эти лица уже писали по-польски». Аб агульным складзе дакументальнага збору даследчык выказваўся: «Словом русского языка очень мало в Несвижском архиве, а русского православного духа и совсем нет».

Не вельмі выніковым быў і візіт у архіў прадстаўніка Пецярбургскай камісіі М. І. Кастамарава. Ён прыехаў да Нясвіжа ў апошнія дні чэрвеня і прабыў там пяць дзён. Яго мэтай, прадстаўленай архівістам, быў пошук дакументаў для падрыхтоўкі манаграфіі па тэмам: Люблінская унія 1569 г., падзелы РП. Але пераважная колькасць патрэбных актаў, як аказалася, была «пераслана да Берліна». М. І. Кастамараву ўдалося папрацаваць толькі з іх рэштай [1, 52—52 адв.].

Пасля экспедыцыі вучоны склаў перад Пецярбургскай археаграфічнай камісіяй справаздачу. Яе вынікі ён ацэньваў станоўча [7, отд. IV, 16—19]. Наколькі яму ўдалося штосьці скарыстаць з фондаў архіва або апублікаваць — звесткі адсутнічаюць. Пасля завяршэння нясвіжскіх пошукаў 17 жніўня 1867 г. галоўнейшы ініцыятар экспедыцыі М. В. Каяловіч пісаў: «Слышу, что и ваша и наша

[1] М. М. Улашчык датаваў летапіс пачаткам XVI ст. [9, 233—236].



экспедиции в Несвиж оказались напрасными: надули нас ляхи. Постараюсь отплатить им за это» [10, 66].

З афіцыйнага варыянта справаздачы аб экспедыцыі, змешчанай прадмове да зборніка матэрыялаў архіва вынікала, што даследчыкі цалкам былі задаволены як прыёмам адміністрацыі Радзівілаў, так і прапанаванымі ім дакументамі. Можна адзначыць адметны афіцыйна-станоўчы, нават узнёслы стыль пры апісанні архіва, яго служачых, іх працы. Адзінае, на што наракалі выдаўцы, гэта на недахоп часу і магчымасцей вывучыць, апублікаваць усе вартыя ўвагі дакументы. Інфарматыўнасць прадмовы дэманстравала разам з тым аднастайнасць падыходаў пры адборы архівалій, пераконвала чытача ў навуковым аб’ектывізме публікатараў [3, VIII].

Вынік экспедыцыі быў наступны. На аснове скапіраваных у Нясвіжскім архіве дакументаў археографы сфарміравалі асобны том (VII) у выдаваемай Віленскай навучальнай акругай серыі. З 400 рукапісаў у яго ўвайшло 267. Дзесяць паходзіла з Рукапіснага аддзела Віленскай публічнай бібліятэкі[1]. Два былі перадрукаваны са зборніка дакументаў, сабраных і выдадзеных мінскім губернатарам А. В. Сямёнавым у 1848 г. пад назвай «Минские акты»[2]. У суме зборнік складаецца з 279 дакументаў за перыяд з 1433 па 1798 г. Галоўнай характарыстыкай сутнасці і канечнай мэты экспедыцыі Віленскай археаграфічнай камісіі выступае тэматыка і змест дакументаў. Тыя факты, што ў археаграфічны зборнік патрапіла толькі 66 % ад сабранага ў Нясвіжскім архіве матэрыялу, што, акрамя дакументаў архіва, там былі прадстаўлены і іншыя сховішчы і выданні — даказваюць адсутнасць у публікатараў строгай задачы прадстаўлення выключна вывучаемага намі збору і разам з тым падцвярджаюць некаторую тэндэнцыйнасць, прысутнасць пэўнай тэматычнай скіраванасці.

Апошняе, дарэчы, імі і не хавалася [3, IX]. Тэматыка выдадзеных матэрыялаў, высновы да якіх прыводзіць аналіз зместу дакументаў, дазваляе раскрыць ідэалагічныя ўстаноўкі, якія павінны былі быць рэалізаваны як нясвіжскай экспедыцыяй, так і археаграфічнай камісіяй увогуле, дэмаскаваць асноўныя пастулаты «рускай ідэі». Згодна са зместам дакументы можна выдзеліць у 10 асноўных тэматычных груп.

1. «Руская» мова і пісьмо на тэрыторыі ВКЛ у XV—XVI ст., іх падабенства з велікарускай мовай і традыцыямі, сацыяльныя слаі бытавання[3]. Усе публікацыі зборніка з датай раней за 1564 г. — выключна на рускай (старабеларускай) мове. Аднак, як ужо адзначалася вышэй, П. А. Гільтэбрандт у лісце да

[1] № 267—269, 271—277.

[2] № 31, 69.

3 № 1—16, 29, 30, 31, 34.



І. П. Карнілава паведамляў аб суцэльнай лацінамоўнасці дакументаў XIV ст., яе дамінаванні ў XV ст. У суме было выяўлена не болей за 40 грамат на рускай мове. Гэта высвятляе адзін з крэтэрыяў адбору дакументаў — рускамоўнасць. Прыярытэтнасць гэтай прыкметы часам дамінавала над якасным узроўнем
крыніц. Нізкая інфармацыйная каштоўнасць некаторых дакументаў прызнавалася самімі аўтарамі[1]. Такім чынам, выбар толькі рускамоўных дакументаў за перыяд 1433—1564 гг. уваходзіў у мэты аўтараў публікацыі і фарміраваў у чытачоў меркаванне аб суцэльным панаванні ў ВКЛ да Люблінскай уніі рускай мовы, а таксама калі не агульнасці, то падабенства мясцовай традыцыі з велікарускай.

2. Люблінская унія[2]. Асноўная ідэя дакументаў сфармулявана выдаўцамі так: «…Несмотря на неполноту и загадочность некоторых известий, всё таки с каждым новым документом, подтверждается тот общеизвестный, непререкаемый факт, что пресловутое соединение «равных с равными и вольных с вольными» есть не более как ложь» [3, X].

3. Стан унутраных і знешніх спраў ВКЛ, становішча насельніцтва напярэдадні і пасля Люблінскай уніі[3]. Прадстаўленыя дакументы сведчаць аб цяжкім становішчы ВКЛ напярэдадні уніі, слабай вайсковай арганізацыі, аб тым, што пасля Люблінскай уніі ў ВКЛ пачаўся працэс суцэльнага апалячвання і акаталічвання, дзяржаўны лад і формы арганізацыі вытворчых адносін былі неэфектыўнымі, вялі да пастаяннага дэфіцыту каралеўскага скарбу, да анархізацыі грамадства, карумпаванасці, усёмагутнасці вышэйшых і прыгнечанага бяспраўнага стану сярэдніх і ніжэйшых слаёў. З гэтага вынікала слабая абароназдольнасць краіны. Абраныя на гэту тэму дакументы, згодна фармулёўцы аўтараў, «рисуют мрачное состояние Литвы и Польши в делах внутренних и внешних беспомощное положение короля… и его подданных» [3, 32].

4. Адносіны з Масквой і звесткі аб Маскоўскай дзяржаве[4]. Высновы, да якіх падводзяць дакументы, наступныя: Маскоўская дзяржава пастаянна імкнулася да захавання добрых адносін з ВКЛ і РП. Войны распачыналіся пераважна

---

1 У заўвазе да ліста Уладзімірскага і Берасцейскага епіскапа Мялеція Храбтовіча да княгіні Кацярыны Слуцкай ад 4 верасня 1581 г. (№ 34) аўтары адзначалі: «Как это письмо, так и письма Ходкевича (…29 и 30) не особенно содержательны; помещены же во уважение к тому обстоятельству, что написаны на языке Русском и лицами историческими» [3, 55].

2 № 19—28.

3 № 13, 17, 18, 32, 33, 36, 38, 43, 53, 56, 65—68, 73, 75, 116, 118, 121, 236, 240.

4 № 32, 33, 45—48, 68, 76, 77, 84, 91, 93, 126, 127, 128, 130, 131, 134—141, 151—157, 160, 161, 162, 173, 176, 187, 188, 190, 191, 198, 200, 213, 217, 219, 221—226, 234, 245, 247—253, 261, 278.



з боку апошняй, прычым прадстаўленыя на гэты конт дакументы паведамляюць пераважна аб ваенных няўдачах літоўска-польскіх войск і аб поспехах маскоўскіх. Расія з’яўлялася верным ваенным саюзнікам РП у канцы XVII—XVIII ст. Пры перамяшчэнні па тэрыторыі РП расійскіх войск ці сталым іх знаходжанні расійскія паслы і военачальнікі заўжды з высокім узроўнем дыпламатычнасці імкнуліся дамаўляцца з мясцовымі ўладамі аб усіх звязаных з гэтым пытаннях. З адваротнага ж боку чыніліся правакацыі. Ваенная прысутнасць Расіі пры дзяржаўных пасяджэннях РП, рабаўніцтва мясцовага насельніцтва і іншыя варожыя дзеянні прадстаўлены як жаданне захаваць парадак у суседняй дзяржаве або як недапрацоўкі мясцовых улад па забеспячэнні прабывання войск саюзнай дзяржавы. Абраныя дакументы з’яўляюцца пераважна лістамі маскоўскага боку да Радзівілаў і сведчаць аб добрых адносінах прадстаўнікоў роду з Расіяй.

5. Казацтва[1]. Прадстаўленыя дакументы указваюць на тое, што Запарожскае казацтва знаходзілася ў прыгнечаным маёмасным і рэлігійным стане, ваявала за праваслаўную веру, было ў добрых адносінах з Багуславам Радзівілам, выступаючы разам у абарону праваслаўя. Пасля 1667 г. прыцясненні казакаў і праваслаўнай веры ў РП не спыніліся.

6. Яўрэі [2]. Дакументы паведамляюць аб тым, што яўрэі неаднаразова распачыналі судовыя працэсы супраць праваслаўных за маёмасць, ганьбілі цэрквы, нападалі на святароў, з’яўляліся непастаяннымі пры

пераходзе ў хрысціянскую веру, увогуле, рознымі шляхамі прыцяснялі хрысціян (не толькі праваслаўнай канфесіі), асабліва ў мястэчках.

7. Уніяты[3]. Дакументы, прыведзеныя да тэмы, сведчаць аб кар'ерызме, далёкасці ад духоўных каштоўнасцей прадстаўнікоў вышэйшага уніяцкага духавенства, іх нецярпімасці да праваслаўных, гвалтоўных захопах цэркваў, але разам з тым аб невыкананні ўмоў Брэсцкай уніі па ўвядзенні прадстаўнікоў уніяцкага духавенства ў склад паноў-рад, цяжкім і залежным матэрыяльным становішчы уніятаў, прыцясненнях з боку радзівілаўскай адміністрацыі і г. д.

8. Кальвінізм, лютэране[4]. Згодна з прадстаўленымі дакументамі, знаходзіліся ў цяжкім стане, выступалі як саюзнікі праваслаўя ў супроцьстаянні каталіцызму і уніяцтву.

---

[1] № 37, 39, 41, 42, 55, 57, 60, 63, 66, 67, 72, 76—83, 87, 88, 95, 96, 108, 116, 118, 122, 129, 132.

[2] № 35, 85, 102, 110, 111, 117, 125, 148, 167, 186, 195, 201, 214, 228, 237.

[3] № 49, 59, 71, 144, 158, 159, 163, 163, 171, 196, 197, 220, 232, 271—276.

[4] № 59, 75, 86, 89, 104, 105, 255, 262.



9. Гісторыя Нясвіжа і іншых уладанняў Радзівілаў, прыватны быт, навука, культура[1]. Гэта нешматлікія дакументы, згодна з якімі князі Радзівілы падтрымлівалі пастаянную баяздольнасць падуладнага насельніцтва. Анархія і злачыннасць, якая панавала ў ВКЛ, не абыходзіла нават ні ў чым незаангажаваных навукоўцаў Нясвіжскай акадэміі. Адным са станоўчых момантаў выступала аднаўленне Радзівіламі ўсярэдзіне XVIII ст. Нясвіжскай друкарні.

10. Становішча праваслаўнай царквы ў ВКЛ. Выдаўцы сцвярджалі, што да дадзенай тэмы адносіцца найбольш значная колькасць дакументаў. Шмат крыніц з іншых груп таксама тым ці іншым чынам закранаюць дадзенае пытанне [3, XI]. Асноўны від матэрыялаў — карэспандэнцыя (адрасаты — Радзівілы). Яе стваральнікамі з'яўляліся: а) рускія военачальнікі, паслы, рэзідэнты; б) кіеўскія праваслаўныя і уніяцкія мітрапаліты; в) магілёўскія і беларускія праваслаўныя епіскапы; г) полацкія архіепіскапы і беларускія мітрапаліты; д) ігумены, іераманахі, прыходскія святары; е) слуцкія архімандрыты і іх намеснікі.

Галоўныя высновы, якія дазваляюць зрабіць дакументы разглядаемай групы, наступныя. Найбольш старажытным і ўпартым барацьбітом за права на свабоду веры з'яўлялася Віленскае праваслаўнае Свята-Духаўскае брацтва[2], спыненне актыўнасці якога (кан. XVII ст.) стала пачаткам суцэльнага маршу каталіцызму і уніяцтва. Публікатары адзначалі, што пасля гэтага змяняецца нават стыль лістоў праваслаўнага духавенства, сярод якіх станоўча выдзялялі толькі лісты Магілёўскага епіскапа Іераніма Ваўчанскага[3] і Слуцкага архімандрыта Феадосія Васілевіча[4]. Слуцкая архімандрыя, якая знаходзілася ва ўладаннях Радзівілаў, была Кіеўскім намесніцтвам, выступала сапраўдным «аплотам» праваслаўя ў Паўночна-Заходняй Русі[5].

Пасля Брэсцкай уніі праваслаўнае насельніцтва і духавенства знаходзіліся ў абсалютна бездапаможным, прыгнечаным становішчы, пастаянна церпячы

---

[1] № 10, 11, 29, 30, 36, 43, 74, 133, 155, 179, 180, 181, 184, 199, 216, 266.

[2] № 40, 50, 51, 52, 58, 62, 119, 120, 123, 124.

[3] № 164—170, 174, 175, 178, 183, 189, 193, 202, 206—208, 265, 264.

[4] № 90, 92, 97—103, 106, 107, 109—115, 117.

[5] № 90, 92, 99, 100, 107, 109, 112, 113, 114, 142, 143, 150, 218, 227, 229, 230, 231, 233, 235, 238, 241—244, 256, 258, 259, 260, 279. Да канкрэтных асоб адносяцца дакументы: 92, 99, 100, 107, 109, 112, 113, 114 (архімандрыт Ф. Васілевіч), 203, 204, 205 (архімандрыт М. Казачынскі), 218 (архімандрыт Д. Нашчынскі), 227, 229, 230, 231, 233, 235, 238, 241, 242, 244 (архімандрыт Д. Галахоўскі), 256 (кандыдат на архімандрыю Г. Свадкоўскі), 258, 259, 260 (В. Свадкоўскі), 279 (намеснік архімандрыта), 264, 265 (Рускі Мітрапаліт Вільямін Рудскі) [3, XIII—XIV].



гвалтоўныя напады на веру, маёмасць[1] і ўласную асобу з боку каталіцкага і уніяцкага насельніцтва як цывільнага, так і духавенства, габрэяў і інш.[2] Не толькі праваслаўныя, але і многія уніяцкія цэрквы і іх

прыхажане былі ў незадавальняючым маёмасным стане, абсалютна залежным ад уладальнікаў зямель, на якіх яны размяшчаліся, што вымушала болей дбаць аб хлебе надзённым, чым духоўным[3]. Ніжэйшае духавенства з-за сваёй галечы адрознівалася слабай адукаванасцю і амаральнасцю паводзін[4].

Некаторыя прадстаўнікі рода Радзівілаў апекаваліся праваслаўем і, як і пратэстантызм, абаранялі і падтрымлівалі яго, аднак стаўленне да праваслаўных моцна залежыла ад палітычных абставін і ад абавязкаў, ускладзеных на князёў прывілеямі продкаў[5]. Выдаўцы хоць і адзначалі станоўчую ролю князёў Радзівілаў, у прыватнасці Крыштафа і Багуслава, у падтрымцы праваслаўя, але трактавалі іх пазіцыю як кан'юнктурную і непастаянную [3, XII—XIII]. Ва ўладаннях Радзівілаў, належыўшых княгіні Луізе-Шарлоце, у абарону праваслаўных выступалі прускія ўлады[6]. Расійскія ўлады праз сваіх паслоў ці военачальнікаў пастаянна патрабавалі спыніць прыцясненні праваслаўных, ураўняць іх правы з каталікамі[7].

У зборніку выдаўцы прадставілі як выключна ілюстратыўны і матэрыял да гісторыі гарадоў і мястэчак[8], гісторыі Запарожжа, прыватнага быту ў Літве і Польшчы і інш. Аднак пры непасрэдным разглядзе відавочна, што шырокае асвятленне дадзеных тэм не ўваходзіла ў мэты выдаўцоў. Абраныя дакументы адпавядаюць агульнай канцэпцыі тома і змяшчаюць у асноўным негатыўныя характарыстыкі заходніх суседзяў Расіі.

---

[1] Аб гвалтоўным пераводзе праваслаўных цэркваў і іх маёмасці ў унію сведчаць дакументы № 103, 145, 147, 167, 168, 177, 183, 189, 193, 194, 206, 208, 209, 210.

[2] Прыцясненні праваслаўных чыніліся: з боку замкавай адміністрацыі і іншых упраўляючых: № 98, 150, 170, 178, 207, 259), княжаскіх ураднікаў, камісараў і пасэсараў (№ 44, 65, 111, 115, 117, 208, 211, 215, 254, 269), гарнізонных, харугоўных і жаўнерскіх военачальнікаў (№ 94, 149, 169, 185, 188, 202, 246), езуітаў (№ 182, 192, 212), яўрэяў (№ 85, 102, 148, 186, 195, 214, 228, 239).

[3] № 16, 31, 58, 62, 69—71, 74, 94, 97, 106, 119, 123, 142, 146, 149, 165, 172, 257, 267, 268.

[4] № 101, 212, 276.

[5] № 55, 61, 64, 97, 110, 255, 263, 264, 265, 270.

[6] № 120, 255.

[7] № 140, 141, 161, 162, 188, 222, 249, 250, 251, 267, 268, 269, 277

[8] Сямятычы (№ 35), Вярболава (№ 53), Мінск (№ 54), Коўна (№ 56, 237, 262), Магілёў (№ 68), Полацк (№ 73), Кейданы (№ 104, 105), Заблудава (№ 125), Нясвіж (№133, 155, 266), Крычаў (№ 179, 181), Львоў (№ 236, 240).



Такім чынам, дакументы Нясвіжскага архіва, выдадзеныя ў зборніку, па сутнасці, апраўдвалі панаванне Расійскай імперыі на тэрыторыі былога ВКЛ і РП. Публікацыя цалкам адпавядала мэтам, якія ставіліся дзяржаўнымі ўладамі перад Віленскай археаграфічнай камісіяй ды і іншымі падобнымі ўтварэннямі. Іх выразна сфармуляваў у свой час М. Н. Ясінскі: «Главная цель, которую преследовала Комиссия… — это доказать, во-первых, что православная вера долгое время была самой распространённой в пределах западнорусского государства, и, кроме того, отметить все, что носило там на себе отпечаток православия и русской национальности, а во-вторых, выяснить древний экономический и юридический быт Западного края и вместе с тем показать, как на нём пагубно отразилось влияние польских элементов, какая беспорядочность вследствие этого царила в Литовско-Русском государстве в XVII—XVIII вв.» [11, 6—7]. Важна тое, што падрыхтаванае выданне змяшчала трактоўкі не вельмі чаканыя, нават не прымальныя для Радзівілаў, як гаспадароў архіва, як паважлівых нашчадкаў знатнейшага і магутнейшага роду ў РП, патрыётаў айчыны. Адным з важнейшых вынікаў экспедыцыі 1867 г. стала негалосная забарона для расійскіх даследчыкаў на асабісты доступ не толькі да Нясвіжскага архіва, але і іншых родавых збораў. Публікацыйная дзейнасць, якую разгарнулі Віленская навучальная акруга, Віленская і іншыя археаграфічныя камісіі ў другой палове XIX — пачатку XX ст., тэматычная скіраванасць іх выданняў пераконвалі ўладальнікаў прыватных збораў на беларускіх землях у немэтазгоднасці супрацоўніцтва з расійскімі археографамі і расійскімі навукоўцамі ўвогуле. Адносна Нясвіжскага архіва можна заўважыць, што да канца 1930-х гг. выпадкаў доступу ў яго расійскіх даследчыкаў не адзначана.

## ЛІТАРАТУРА

1. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (НГАБ). Ф. 694. Воп. 1. Спр. 438. Справаздачы аб стане Нясвіжскага архіва і аб рабоце ў ім даследчыкаў з Пецярбурга і Вільні (са звесткамі па гісторыі архіва). Справаздача аб працы бібліятэкі архіва 1853—1886 гг.
2. Тамсама. Спр. 439. Дакументы аб перадачы манускрыптаў з фонду Радзівілаў у Варшаўскі архіў 1853 г.

3. Археографический сборник документов, относящихся к истории Северо-Западной Руси, издаваемый при управлении Виленского учебного округа: в 14 т. Вильна: Сыркин А. Г. Типогр., 1867—1904. Т. VII: Собранный в Несвиже / изд. : П. Гильтебрандт, А.Миротворцев. 1870. XXIV. 375 с.
4. Латушкін, А. М. Нясвіжскі архіў Радзівілаў (1838—1873 гг.) / А. М. Латушкін // Беларускі гістарычна часопіс. 2006. № 1 (78). С. 37—41.
5. Леонтьева, Т. Е. Документальные материалы фонда князей Радзивиллов как исторический источник / Т. Е. Леонтьева // Вопросы архивоведения и источниковедения в БССР. Минск, 1971. С. 306 — 319.
6. Летопись занятий Археографической комиссии: в 35 вып. / ред. К. Н. Бестужев-Рюмин. СПб.; Л., 1861—1928. Вып. 4: 1865—1866 гг. 1868. 758 с.
2387. Летопись занятий Археографической комиссии: в 35 вып. / ред. Е. Е. Замысловский. СПб.; Л., 1861—1928. Вып. 5: 1867—1870 гг. СПб., 1878. 595 с.
8. Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. М.: Наука, 1973. 301 с.
9. Улащик, Н. Н. Введение в изучение белорусско-литовского летописания / Н. Н. Улащик. М.: Наука, 1985. 259 с.
10. Ульяновський, В. «Русское дело в Северо-Западном крае» через призму історії магнатських архівів Сапєг та Радзивіллів у XIX ст. / В. Ульяновський. К. : НАН України, Ін-т укр. археографії та джерелознавства ім. М. С. Грушевського, 1998. 104 с.
11. Ясинский, М. Н. Обзор последних изданий Виленской археографической комиссии. Т. XI—XVII / М. Н. Ясинский. К., 1893. 15 с.